This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2023.pp.297-324

Przegląd Środkowo-Wschodni, 8, 2023
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20230812

Data przesłania: 05.03.2023
Data akceptacji: 18.04.2023

**Аляксандр Пагарэлы**
Badacz niezależny
mbv.mancunian@gmail.com
https://orcid.org/0000-0003-2182-6656

# Беларусь як дзяржава „пасярэдзіне"

## Piotra P. Murzionak, *Belarus: prospects of a middle power,* Lanham–Boulder–New York–London 2022, xxxvi+311 pp.

З'яўленне ў Паўночнай Амерыцы ці Заходняй Еўропе кніг прысвечаных Беларусі, якія б прапаноўвалі паглядзець на гісторыю, культуру і грамадскія працэсы ў шырокім тэматычным і храналагічным кантэксце, а яшчэ б закраналі пытанні перспектыў краіны і сцэнараў развіцця ў будучыні, адносіцца да рэдкіх падзеяў. Манаграфіі такога характару ад прадстаўнікоў беларускай дыяспары за мяжой з'яўляюцца яшчэ радзей[1]. Аўтарскія праекты часцяком не прывязаны да нейкіх падзей і іх стварэнне прыпадае на больш „спакойныя" часы. Тым больш важна, што калі надыходзяць менш „спакойныя" часы, грамадская вага такіх кніг і іх значэнне толькі ўзрастаюць. Само з'яўленне такіх манаграфій можна без пафасу назваць сведчаннем пачуцця грамадзянскага абавязку і вялікім укладам у веды грамадства пра сябе. Цяжка перабольшыць значэннне такіх манаграфій для міжнароднай аўдыторыі ў момант, калі, паводле глыбокага пераканання аўтара гэтай рэцэнзіі, Беларусі можа па-

[1] Гл., напрыклад: Savchenko A., *Belarus – a Perpetual Borderland*, Leiden–Boston 2009.

гражаць страта суверэнітэта, тэрытарыяльнай цэласці і знікненне з палітычнай мапы. У наш час эфемернага дыгітальнага існавання значнай колькасці людзей, якое напаўняе іх жыццё бясконцым баражом інфармацыйнага шуму[2], добра ведаць, што крытычны і аналітычны погляд на мінулае і сучаснасць Беларусі, перасцярога аб яе будучыні знайшлі свой голас. Такім голасам стала кніга Пятра Мурзёнка „Беларусь: перспектывы дзяржавы пасярэдзіне”.

Сама назва манаграфіі звязана з аднаго боку, з жаданнем беларусаў бачыць сябе геаграфічным цэнтрам Еўропы (і быць у цэнтры ўвагі). З іншага боку, гэта звязана з цывілізацыйным пасярэдніцтвам Беларусі паміж еўразійскім Усходам, якім прадстаўлена Расія, і Еўропай, часткай якой так ці інакш (палітычна, ментальна, у цывілізацыйным сэнсе ці толькі геаграфічна) бачаць сябе беларусы. Існаванне Беларусі, паводле аўтара манаграфіі, вызначаецца супрацьстаяннем „Усходу” і „Захаду” (p. xv).

Пётр Мурзёнак, беларускі і канадскі даследчык-беларусіст, фізіёлаг, літаратар і грамадскі дзеяч, кіраўнік Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Канадзе (Belarusian Institute of Arts and Sciences, Canada), адной з найважнейшых грамадска-культурных і навуковых пляцовак арганізаванай беларускай дыяспары ў Паўночнай Амерыцы і па-за межамі Беларусі.

Кніга стала плёнам разваг і дыскусій на старонках часопіса „Сакавік” (“Культура. Нацыя”), якія пачаліся ў 2012 г. (p. x). Аднак не будзе перабольшаннем сказаць, што манаграфія стала вынікам яшчэ ранейшых шматгадовых рэфлексій і роздумаў аўтара. Прамежкавым этапам перад стварэннем гэтай манаграфіі можна лічыць кнігу даследчыка „Шляхі да беларускай нацыі”[3]. Адразу трэба сцвердзіць, што хоць аўтар і не з’яўляецца паводле адукацыі гісторыкам ці культурным антраполагам, несправядліва было б ацэньваць манаграфію як толькі погляд непрафесіянала. Усё зусім наадварот.

[2] Foer F., *World without Mind. The Existential Threat of Big Tech*, London 2017.
[3] Мурзёнак П. М., *Шляхі да беларускай нацыі*, Мінск 2016.

Аўтар вельмі добра арыентуецца ў гістарычных, антрапалагічных і культуралагічных аспектах праблем, якія аналізуе. Кніга напісана на высокім даследчыцкім узроўні. Добра відаць, што, кніга стваралася ў сталым дыялогу з прафесійнымі даследчыкамі беларускай тэматыкі. Кніга абапіраецца на шырокае кола тэматычна і дысцыплінарна разнастайнай літаратуры і з’яўляецца прыкладам інтэрдысцыплінарнага даследвання.

Добра прадумана структура кнігі паводле праблемнага падыхода. Манаграфія Пятра Мурзёнка складаецца з 15 раздзелаў. Уключае яна таксама змястоўныя дадаткі, якія дазваляюць чытачам атрымаць грунтоўную інфармацыю пра гістарычны кантэкст і постаці звязаныя з Беларуссю. Важнай з’яўляецца інфармацыя аб дзяржаўных, культурных, навуковых і мастацкіх дзеячах Беларусі, якая выходзіць па-за межы стандартных сёняшніх вікіпедыйных схем (p. xxix–xxxv). Таксама аўтар дае ў шостым раздзеле інфармацыю пра сучасную Беларусь, яе культуру, спорт, навуку, гаспадарку (p. 99–112).

Кніга закранае важныя тэмы, якія патрабуюць асэнсавання і рэфлексіі. Аўтар задумваецца аб праблематыцы нейтралітэта Беларусі і паказвае кантэкст пытання дэманструючы прыклады іншых краін, якія абралі гэты шлях. Таксама Пётр Мурзёнак абмяркоўвае перспектывы еўрапейскай інтэграцыі Беларусі, яе характар і перадумовы. Даследчык бярэцца асэнсаваць падзеі 2020 г. і называе іх „рэвалюцыяй надзеі” у прысвечаным ёй асобным пятнаццатым раздзеле (p. 225–237). Гэта фактычна першая манаграфічная спроба асэнсаваць гэты неадназначны перыяд нядаўняй айчыннай гісторыі.

У манаграфіі таксама аналізуюцца самыя розныя магчымыя (і актуальныя ў сэнсе іх функцыянавання на сёняшні дзень ў Беларусі) мадэлі дзяржаўнасці адносна ролі ў іх этнакультурнага (этнанацыянальнага) фактара. Пры гэтым самым галоўным матывам у кнізе з’яўляецца супольнасць лёсаў украінцаў і беларусаў. Аўтар нават лічыць, што абодва народы ўтваралі адну супольную бела-

руска-украінскую (або русінскую) цывілізацыю (p. 53, 55–71, 73, 79, 84, 127, 247), лёсы і сацыяльныя, культурныя і ментальныя характарыстыкі якой рэзка адрозніваюцца ад расійскай (маскоўскай) дзяржаўнасці Еўразіі, якая заснавана на імперыялістычнай тэрытарыяльнай экспансіі і традыцыі сакралізаванай палітычнай дэспатыі[4]. У сярэднявечны і раннемадэрны перыяд дастаткова выразна назіраецца дыстанцыяванне (ці ўвогуле падкрэсленая самаізаляцыя) маскоўскай дзяржавы ад заходнееўрапейскіх уплываў у адрозненні ад беларускіх і украінскіх зямель у складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай[5]. Мурзёнак пераканаўча і слушна падкрэслівае, што гэта хутчэй Вялікае Княства Літоўскае было цэнтрам вакол якога аб'ядналіся ўсходнія славяне, але не Масква (p. 60–63). Ён таксама робіць крытычны разбор еўразійскай ідэалогіі (p. 74–79) як небяспекі не толькі для існавання беларуска-украінскай цывілізацыі, але і для Еўропы таксама (p. 77).

Аўтар прыходзіць да высновы, што беларуска-украінская (або русінская) цывілізацыя з'яўляецца часткай Заходняй цывілізацыі (p. 79–84). Адным з аргументаў, які ён выкарыстоўвае, з'яўляецца існаванне парламентарызму і гарадскога самакіравання на падставе нямецкага (магдэбургскага) права ў Вялікім Княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай (p. 73). Варта дадаць, што ў эпоху падзелаў Рэчы Паспалітай у апошнюю трацiну XVIII ст. назіралася сапраўдная адваротная эвалюцыя інстытутаў самакіравання і грамадзянскай супольнасці на украінскіх і беларускіх землях, ператварэнне няхай нешматлікіх, але грамадзян у падданых цара[6]. Даследчык пры гэтым канстатуе, што існуючыя ў літаратуры па геапалітыцы і глабальнай культурна-цывілізацыйнай дыферэнцыяцыі крытэрыі адносяць толькі невялікія часткі Беларусі і Украіны да заходняй ці

[4] Cherniavsky M., *Tsar and people: Studies in Russian myths*, New Haven and London 1961.

[5] Кинан Э., *Російські історичні міфи*, Київ 2001.

[6] Murphy C. G., *From Citizens to Subjects: City, State, and the Enlightenment in Poland, Ukraine, and Belarus*, Pittsburgh 2018.

лацінскай цывілізацыі, але гэтую пазіцыю можна абгрунтавана адкінуць. Аўтар манаграфіі робіць гэта на падставе працы польскага географа Пятра Эберхардта (Piotr Eberhardt) (p. 80).

Аўтар спыняецца таксама на вельмі важным моманце эліт. Ён класіфікуе існуючыя сёння ў Беларусі эліты на кіруючыя і ўласна нацыянальныя (p. 244). Даследчык бачыць крытычна важную ролю нацыянальных эліт у працэсе будавання нацыі. У якасці перадумовы для гэтага аўтар слушна разглядае паглыбленне гістарычнай свядомасці (p. 165). Агулам пашырэнне ведаў аб уласнай гісторыі, культуры і традыцыях сярод жыхароў Беларусі з'яўляюцца ўмовай для таго, што аўтар называе парадаксальнай „беларусізацыяй Беларусі" (і, трэба дадаць, фармаванне грамадзянскай свядомасці). Пры гэтым дзяржава, ці кіруючыя эліты, у гэтым сэнсе, паводле аўтара, або індыферэнтная ці ўвогуле перашкаджае гэтаму працэсу (p. 165).

Працягваючы тэму эліт Мурзёнак спыняецця на сёняшніх палітычных і сацыяльных тэндэнцыях у свеце. Касмапалітычныя эліты ў працэсе глабалізацыі становяцца, паводле Яэль Тамір (Yael Tamir), ўсё менш і менш прывязанымі да нацыянальнага кантэксту, а працоўныя бачаць у нацыяналізме інструмент абароны сваіх інтарэсаў (p. 152, 183). Хоць аўтар не выказвае гэтага адкрыта, але яго разважанні дазваляюць меркаваць, што нацыянальным беларускім элітам не столькі варта кіравацца тым, што з'яўляецца „трэндавым" на глабальнай сцэне, колькі дакладна разумець нацыянальныя інтарэсы (умацаванне пазіцый беларускай мовы, захаванне палітычнай незалежнасці, змяншэнне залежнасці і пагрозы з боку Расіі, узмацненне розных форм бяспекі ў т. л. дэмаграфічнай, энергетычнай, эканамічнай і г. д.). Пры гэтым з прагматычных меркаванняў можна і варта браць „трэндавыя" дыскурсы на ўзбраенне ў якасці заслоны для сапраўдных нацыянальных мэтаў.

Кажучы пра „трэндавыя" і глабальныя дыскурсы трэба сказаць, што дагэтуль крытычна і ўсебакова не ацэнены і не прааналізаваны „раман" беларусаў з сацыялістычнымі ідэалогіямі, камунізмам і марксізмам увогуле. А менавіта ў кантэксце сацыялізму фарма-

ваўся нацыянальна палітычны дыскурс у сітуацыі пасля дэзінтэграцыі ліберальнай ідэалогіі на землях былога Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIX ст. і адбывалася гэта пры спрыянні Польскай Сацыялістычнай Партыі (ППС) на пачатку XX стст[7]. Да тэмы сацыялізму мы яшчэ вернемся ніжэй.

У дзесятым раздзеле аўтар аналізуе розныя тэарэтычныя мадэлі нацыі на падставе інсуючай заходняй (пераважна брытанскай і паўночнаамерыканскай) літаратуры (p. 155–168). Ён вылучае чатыры сцэнары, якія акрэліваюць лёс Беларусі ў будучыні: 1) захаванне сёняшняй сітуацыі (па змаўчанні, дэ-юрэ незалежнасці Беларусі); 2) „добраахвотнае" далучэнне да „рускага міру"; 3) сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе; 4) спроба дыстанцыявацца ад Расіі праз узброены нейтралітэт і далучыцца да агульначалавечай (sic!) цывілізацыі, якая прыйдзе на змену цяперашняй і ў якой (што ўсё ж з'яўляецца хутчэй утапічным бачаннем) вялікія дзяржавы будуць паважаць інтарэсы маленькіх і сярэдніх (p. 166). Але крыху вышэй Пётр Мурзёнак канстатуе, што цяжка прадказаць, які шлях абярэ Беларусь у сэнсе цывілізацыйнай арыентацыі (p. 152), хоць у папярэднія гады інтэлектуалы Беларусі з пераважна ліберальнымі поглядамі патрацілі шмат высілкаў, каб акрэсліць шляхі не беларусізацыі, але „еўрапеізацыі" Беларусі[8]. У свой час нават маскоўскія навіны „ИТА" у сваім рэпартажы з Мінска ў студзені 1993 г. высока ацэньвалі магчымасці і перспектывы еўрапейскай інтэграцыі Беларусі падкрэсліваючы высокі прамыслова-тэхналагічны, навуковы, інфраструктурны і чалавечы патэнцыял краіны[9].

Адносна ж негатыўных сцэнараў трэба сказаць, што пры канцы XIX-пачатку XX стст. таксама хапала засцярог і трывог адносна

[7] Туронак Ю., *Узаемадзеяньні ППС зь беларускім рэвалюцыйным рухам у 1902–1906 гадох*, [у:] Туронак Ю., *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 55–65.

[8] *Пути европеизации Беларуси: между политикой и конструированием идентичности 1991–2010*, ред. О. Шпарага, Минск 2011.

[9] Запіс у архіве аўтара.

лёсаў Беларусі. Украінскі фактар, хоць толькі да некаторай ступені, меў і тады свой уплыў на погляды беларусаў. Выбітны дзеяч Польскай Сацыялістычнай Партыі (ППС), паплечнік Юзафа Пілсудскага, міністр замежных спраў Польшчы Леон Васілеўскі (1870–1936) успамінаў пра сваю маладосць у Пецярбурзе, што прыкладна ў канцы 1880-х гг., г. зн. некаторы час перад з'яўленнем „Дудкі беларускай" Францішка Багушэвіча, сярод праваслаўных беларусаў ніякага нацыянальнага руху не назіралася. Ён быў знаёмы з адным судовым чыноўнікам з Рагачоўшчыны, які, паводле яго, быў пад пэўным украінскім уплывам. Васілеўскі спрабаваў разбудзіць у таго пачуццё беларускага „сепаратызму", чыноўнік нават першапачаткова зацікавіўся гэтым. Пазней усё ж яго зацікаўленасць знікла і ён сцвердзіў, што ўжо запозна і што сацыялістычная ідэя прывядзе Беларусь да збліжэння і асіміляцыі з Вялікаросіяй[10]. Не спраўдзіліся таксама трывогі Васілеўскага адносна патэнцыяла ўнутраных канфліктаў на рэлігійнай глебе у заходняй частцы Беларусі (гістарычнай Літве), якую ён параўноўваў з канфесійна стракатай Босніяй[11].

Усё ж існуе, паводле Мурзёнка, магчымасць стварыць сёння ў Беларусі этнакультурную ці этнанацыянальную дзяржаву нягледзячы на негатыўныя тэндэнцыі (p. 243). Аўтар лічыць наступны перыяд пасля 2020 г. спрыяльным для нацыянальнага будаўніцтва ў Беларусі таксама як у першай траціне XX ст. ці ў першай палове 1990-х гг. (p. 262).

Даследчык страецца давесці, што нейтралітэт дасць Беларусі маральныя і прававыя падставы супраціўляцца вайсковай ці эканамічнай агрэсіі (p. 201). Ён паказвае ўсе супярэчнасці і неадназначнасць нейтралітэта ў трынаццатым раздзеле кнігі (p. 193–203). У якасці непрыхаванай і яўнай пагрозы незалежнасці, суверэнітэта Беларусі і, варта дадаць, нават самой нацыянальнай ідэнтычнасці ў сучасны

---

[10] Wasilewski L., *Wspomnienia 1870–1904 (1914). Fragmenty dziennika 1916–1926. Diariusz podróży po kresach 1927*, Warszawa 2014, s. 65.

[11] Wasilewski L., *Litwa i Białoruś: przeszłość – teraźniejszość – tendencje rozwojowe*, Kraków 1912.

момант, аўтар манаграфіі абгрунтавана разглядае Расію (p. 180), якая з'яўляецца недэмакратычнай краінай-агрэсарам (p. 199). Пры гэтым аўтар слушна звяртае ўвагу на абаронны патэнцыял Беларусі, які нельга назваць благім для магчымага ўзброенага нейтралітэта ўлічваючы хаця б характарыстыкі ракетнага комплекса „Паланэз", распрацаванага сумесна з Кітаем (p. 243).

Пётр Мурзёнак дзеліцца сваімі назіраннямі і дае зразумець, што без адзінства палітычных партый, недзяржаўных арганізацый і актыўных грамадзян немагчыма дэмакратычная будучыня Беларусі. Пры гэтым крыху вышэй ён справядліва заўважыў, што без вырашэння нацыянальных пытанняў барацьбы за дэмакратычныя ці ліберальныя каштоўнасці не будзе дастаткова, каб змяніць свядомасць беларусаў (p. 221). Там жа аўтар слушна піша, што інтэрнэт-прастора дастаткова раздробнена, там няма адзінства. Агулам нягледзячы на высокую долю карыстальнікаў інтэрнэта ў Беларусі ён як і сацыяльныя медыі (сацыяльныя сеткі) знаходзіцца пад кантролем ураду (p. 221, 211). Гэтыя ацэнкі супадаюць з тым, што піша беларуска-амерыканскі аўтар і інтэлектуал Яўген Марозаў (Evgeny Morozov). Інтэрнэт не стаў насуперак ілюзіям інструментам свабоды, але кантролю за грамадствам. Драбненне сацыяльнай і культурнай прасторы[12], а як наступства гэтага – і палітычнай, маніпуляцыі, збіранне інфармацыі аб і ад карыстальнікаў living рознага характару далёкія ад „дыгітальнай утопіі", якая на мяжы XX і XXI стст. падавалася дасяжнай[13]. Так што можна канстатаваць, што тыя надзеі, якія ўскладаліся на інтэрнэт як інструмент дэмакратызацыі беларускага грамадства некаторымі даследчыкамі, дагэтуль не спраўдзіліся[14].

Досыць важнае назіранне аўтар робіць аб тым як бы, на яго думку, рэагавалі беларусы ў выпадку ўзброенай атакі з боку Расіі.

---

[12] Morozov E., *The net delusion: the dark side of internet freedom*, New York 2011; Morozov E., *To Save Everything, Click Here: The Folly of Technological Solutionism*, New York 2013.

[13] Foer F., *World without Mind* (Publication: 2017), https://www.theguardian.com/books/2017/oct/25/world-without-mind-by-franklin-foer-review.

[14] Savchenko A., *Belarus – a Perpetual Borderland* (Publication: 2009), https://brill.com/display/title/15694?language=en.

Паводле яго, беларусы не акажуць супраціву не таму, што ёсць недахоп у абаронцах, але таму, што беларусы як іншыя цывілізаваныя нацыі аддаюць перавагу грамадзянскаму супраціву (p. 208). Даследчык таксама адзначае, што Беларусь атрымала незалежнасць мірным шляхам (p. 153). Пры тым, што павярхоўна гэта павінна было б характарызаваць Беларусь як шляхетнае і цывілізаванае грамадства з адпаведнымі каштоўнасцямі, у практыцы гэта азначае, што ў ваенна-палітычным вымярэнні Беларусь можа быць тэрыторыяй, з якой магчыма ажыццяўленне далейшай агрэсіі супраць дзяржаў, якія мяжуюць з ёй. Гэта ўжо бярэцца ў разлік экспертамі па вайскова-стратэгічных пытаннях[15].

Даследчык бачыць у "ментальнасці выжывання", якая ўкаранілася ў беларускім грамадстве, перашкоду для развіцця нацыянальных і грамадзянскіх пачуццяў, бо беларусы хутчэй абіраюць не свабоду, а выжыванне, хоць аўтар і бачыць у гэтым і пазітыўны бок (p. 133). Ён з горыччу ўказвае на „неканструктыўную крытыку" (p. 217–218) і ўзаемную падазронасць і нават „шпіёнаманію" (p. 218–219), якія паводле яго, паралізуюць дзейнасць нацыянальных эліт. З гэтага моманту хацелася б пачаць крытычны разгляд манаграфіі Пятра Мурзёнка і сігналізаваць тыя моманты і пастулаты, якія, паводле аўтара гэтага агляду, з'яўляюцца спрэчнымі, а таксама на памылкі, якія даследчык зрабіў на старонках кнігі.

Калі вяртацца да тэзісаў аўтара адносна нацыянальных эліт, якім прысвечаны цэлы чатырнаццаты раздзел (p. 205–224), то відавочна ўсё ж ён меў на ўвазе не столькі эліту, але палітычную апазіцыю. Даследчык недастаткова добра размежаваў гэтыя паняцці. Адносна палітычнай апазіцыі ў Беларусі, якую некаторыя аўтары лічаць неэфектыўнай[16], трэба адзначыць, што яна наўрадці ўклю-

---

[15] Parafianowicz, R., *The military-geographical significance of the Suwałki Gap*, „Security and Defence Quarterly", 2017, Vol. 17, № 4, p. 3–20.

[16] Ланеўскі А., *Гісторыя палітычнай неэфектыўнасці: польскі погляд на беларускую апазіцыю*, „Беларускі гістарычны агляд", 2016, Т. 23 (сш. 1–2), с. 288–310.

чае ў сябе ўсю групу, якую можна назваць нацыянальнай элітай. Пры тым, што карані кіруючай эліты трэба шукаць у савецкай наменклатуры (на што аўтар не звярнуў належнай увагі, хоць ёсць даступная заходняя літаратура па гэтым пытанні ўжо перакладзеная на беларускую мову[17]), нельга яе цалкам лічыць антынацыянальнай ці толькі такой, якая чыніць перашкоды ці не дапамагае працэсам нацыяналізацыі беларускага грамадства. Тым больш варта было б аўтару звярнуць увагу на цікавыя працэсы, якія адбываліся сярод рэгіянальных эліт Беларусі ў постсавецкі перыяд[18]. Занадта аднабокім уяўляецца і тое, што аўтар пры зрэшты справядліва адзначанай шкоднасці ўзаемных прэтэнзій і канфліктаў не дапускае, што на апазіцыйным полі краіны можа гуляць і гуляе таксама Расія са сваімі імперскімі інтарэсамі зацікаўленая ва ўтрыманні кантролю над Беларуссю. Тым больш, што падзеі 2020 г., на жаль, прымушаюць задумацца пра ролю расійскага фактара не толькі адносна кіруючых эліт, але і апазіцыі[19].

Аўтар яўна супярэчыць сам сабе, калі бярэцца крытыкаваць „фанатычныя" рэлігійныя ідэі ў сучаснасці (p. 146–147). Ён фактычна кажа, што Беларусь упісваецца у сёняшнія трэнды атэізацыі (p. 143). Заяўляе нават пра тое, што, маўляў, цэрквы сеюць варожасць паміж рознымі рэлігіямі (p. 147). Адносна першага трэба заўважыць, што хутчэй праблемы ў сучасным свеце звязаны з пагрозай экстрэмісцкіх і фундаменталісцкіх плыняў ісламу, якія кідаюць выклік і уяўля-

---

[17] Urban M. E., *An Algebra of Soviet Power: Elite Circulation in the Belorussian Republic 1966–86*, Cambridge – New York – Port Chester – Melbourne – Sydney 1989. Беларускі пераклад кнігі Майкла Урбана выйшаў у 2010 г.: Урбан М., *Беларуская савецкая эліта (1966–1986): алгебра ўлады*, Вільня 2010.

[18] Казакевіч А., Смок В., *Алігархія ці вертыкаль? Рэгіянальныя эліты ў Беларусі: эвалюцыя ў 1999–2014,* http://palityka.org/wp-content/uploads/2014/03/Reg_elites_Political_Sphere-2014.pdf (апошняе наведванне 14 траўня 2023 г.).

[19] *Беларуские игры Кремля: кто стоит за лидерами „оппозиции"*, https://sprotyv.info/analitica/belaruskie-igry-kremlya-kto-stoit-za-liderami-oppozicii/ (апошняе наведванне 5 траўня 2023 г.).

юць пагрозу для Заходняй цывілізацыі і яе каштоўнасцей[20]. Даследчык, што заўважна, імкнецца заставацца палітычна карэктным, што навязваюць існуючыя ў заходніх акадэмічных і медыйных сферах пісаныя і непісаныя нормы, а таму і не згадвае іслам. Гэта зразумела і не павінна быць нейкіх закідаў аўтару мааграфіі ў гэтай сувязі. Аднак аўтар гэтага агляду адмаўляе палітычную карэктнасць як шкодную і небяспечную для грамадскага дыялогу і акадэмічнага жыцця і таму лічыць інакш.

У сувязі з другім сцвярджэннем аўтара таксама ёсць пытанні. Ён прыводзіць адпаведныя лічбы з сацыялагічных даследванняў рэлігійнасці беларускага грамадства, але таксама не дапускае, што сітуацыя можа змяніцца. Таксама ён не звяртае належнай увагі на дэмаграфічны кантэкст рэлігійнай сітуацыі асабліва ў сувязі з рыма-каталіцкім насельніцтва Панямоння і пратэстантамі Палесся ў заходняй частцы Беларусі (p. 144).

Тэзісы Пятра Мурзёнка адносна канфліктнасці, якую нібыта генеруюць арганізаваныя хрысціянскія цэрквы, паўтаруся, супярэчыць таму, што ён сам піша ў сваёй манаграфіі пра ролю царквы і рэлігіі ў гісторыі Беларусі. Аўтар зрэшты не абышоў увагай важнасць царкоўнай уніі для беларусаў (p. 18, 141), рэфармацыі (p. 18, 23. 81), а таксама каталіцкіх ордэнаў часоў контррэфармацыі, а перш за ўсё езуітаў (p. 81). Аўтар мог бы крыху болей месца прысвяціць уніяцкай царкве і значэнню яе ліквідацыі ў 1839 г. У адным месцы, праўда, ён зрабіў памылку, калі указаў у якасці даты далучэння ўніятаў да праваслаўя 1831 год (p. 144). Але калі быць ужо зусім дакладным, то на тэрыторыі сучаснай Беларусі царкоўная ўнія праіснавала да 1875 г., калі ўніяты Польскага Каралеўства на тэрыторыі сёняшняй Сапоцкіншчыны былі далучаны да праваслаўя[21].

---

[20] Buruma I., Margalit A., *Occidentalism. The West in the Eyes of its Enemies*, New York 2004; Murray D., *The Strange Death of Europe. Immigration, Identity, Islam*, London – Oxford – New York – New Delhi – Sydney 2017.

[21] Вашкевіч А., Нарэль Д., *Паміж Ласоснай і Чорнай Ганчай. Гісторыя каталіцкіх парафій у паўднёва-ўсходняй частцы Аўгустоўскай пушчы*, Мінск 2006.

Таксама аўтар мог крыху больш сказаць пра ролю рэлігіі ў фармаванні нацыянальнай эліты і свядомасці, нацыянальнага руху, фармаванні палітычнай культуры ў XX ст. Літаратура і даведнікі па гэтай тэме добра вядомыя[22].

Адносна разваг аўтара пра культурныя і цывілізацыйныя адрозненні маскоўскай дзяржавы ад Украіны і Беларусі і ролі ў генезісе першай ардынскага (мангола-татарскага) элемента, што аўтар досыць слушна даводзіць аналізуючы цюркскае паходжанне прозвішчаў расійскіх дваранскіх сем'яў (p. 61–62), то тут можна было б дадаць і культурна-лінгвістычны момант. У расійскага боку пытанне „штучнага" паходжання таго, што сёння прынята называць „рускай мовай" (украінцы акцэнтуюць яе менавіта „расійскі" характар – „російська мова") выклікае заклапочанасць. На пачатку XXI ст. удзельнікі серыі круглых сталоў аб паходжанні ўкраінскай і беларускай нацый у Маскве нават выказалі занепакоенасць, што сучаснае расійскае грамадства, калі будзе ведаць пра „ненатуральнае" паходжанне сваёй мовы ў параўнанні з украінцамі і беларусамі, якія маюць уласныя мовы і могуць карыстацца рускай, будзе мець у гэтай сувязі „комплекс непаўнавартасці"[23].

Развіваючы сюжэт аб беларуска-украінскай цывілізацыі аўтар мог бы ўспомніць гіпатэзіс, які б калі і не ўзмацніў яго ўласныя тэзысі, то прынамсі дапамог упісаць у пэўную гістарыяграфічную плынь. Гаворка ідзе аб меркаванні выказаным некалі Эндру Уілсанам, паводле якога да сярэдзіны XVII ст. існаваў шанец беларусам і украінцам стаць адной нацыяй[24].

На думку аўтара гэтага агляду, даследчык мог бы больш пераканаўча давесці свой тэзіс аб супольнасці лёсаў украінцаў і беларусаў

---

[22] Конан У., *Ксёндз Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі*, Мінск 2003; *Białoruski ruch chrześcijański w XX wieku. Słownik Biograficyno-Bibliograficzny*, pod. red. J. Garbińskiego, J. Turonka, Warszawa 2003.

[23] *На путях становления украинской и белорусской нации: факторы, механизмы, соотнесения*, Москва 2004.

[24] Wilson A., *The Ukrainians: Unexpected Nation*, New Haven and London 2002.

згадаўшы некаторыя эпізоды падабенства іх інтарэсаў у мінулым і сучаснасці. Не варта, канечне, прадстаўляць супольнасць гэтых інтарэсаў у духу савецкай гістарыяграфіі, якая прадукавала адпаведныя наратывы паводле ідэалагічнай замовы[25]. Таксама дэманстрацыя гістарычнага кантэксту і некаторых супярэчнасцяў паміж народамі дазволіла б зразумець, што агульнага больш, чым уяўлялася ў моманты разыходжання.

Гэта зусім не абмяжоўваецца сярэднявечнымі эпізодамі канфліктаў паміж Полацкам і Кіевам (p. 14). Да прыкладу, ужо само стварэнне беларускай савецкай дзяржаўнасці ў 1920-я гг. было неабходна як супрацьвага Украіне з яе т. зв. „нацыяналістычнымі тэндэнцыямі", якія, паводле бальшавіцкага кіраўніцтва, уяўлялі пагрозу для стабільнасці ўсяго СССР[26]. Нельга недаацэньваць фактар геапалітычных інтарэсаў маскоўскіх бальшавікоў у гэтай сувязі[27].

У якасці яшчэ аднаго эпізода разыходжання інтарэсаў беларусаў і украінцаў можна назваць збліжэнне і паразуменне ўкраінскх палітычных сіл у Сойме з польскім бокам у міжваеннай Польшчы ў сярэдзіне 1930-х гг. Гэта ўскладніла магчымасці палітычнага манеўравання для беларусаў, значна абмежавала магчымасці беларуска-украінскага ўзаемадзеяння ў той час[28].

Не зусім зразумела, што Пётр Мурзёнак мае на ўвазе, калі піша пра талерантнасць. Тое, што аўтар вызначае як талерантнасць паводле свайго сэнсу хутчэй можа азначаць „цярплівасць" ці „трываласць" (p. 133–134). Калі гаворка ідзе пра сёняшні дзень, то хутчэй

[25] Кондуфор Ю., Афонин Ю., *Нерушимая дружба украинского и белорусского народов в период социализма*, Киев 1978.

[26] Hirsch F., *Empire of Nations. Ethnographic Knowledge and the Making of the Soviet Union,* Ithaca & London 2005, p. 150.

[27] Czarniakiewicz A., *„Obcy w trzecim rzędzie": państwo białoruskie jako produkt rosyjskiej geopolityki*, [w:] *Ofiary imperium. Imperia jako ofiary. 44 spojrzenia*, red. A.Nowak, Warszawa 2010, s. 476–482.

[28] *IV. Sprawy narodowości Białoruskiej. 2. Życie polityczne* [w:] *Sprawozdanie z życia mniejszości narodowych za IV kwartał 1935 r. Wydział Narodowościowy*, Warszawa 1936, Archiwum Akt Nowych, Sygn. 963, K 46 (s 45).

варта казаць пра павагу да тых этнічных меншасцей, якія жывуць у Беларусі, а не „любоў" (p. 113). Такі выраз больш падыходзіць да вакабуляра турыстычных даведнікаў і буклетаў, але не навуковай манаграфіі. Сэнс рэлігійнай і этнічнай талерантнасці ў Еўропе і Беларусі змяняўся на працягу гісторыі. Цяжка сказаць, што азначала б паводле аўтара рэлігійная талерантнасць беларусаў. Ці ў мінулым гэта было тое самае, што назіралася на раннемадэрным еўрапейскім захадзе, дзе талерантнасць магла значыць столькі ж, колькі проста дазвол фізічна існаваць іншаверцам і не быць забітымі[29]. Ці можна гэта акрэсліць як „талерантнасць да зла" ці гэта нейкі механізм, што акрэсліваецца як „рэпрэсіўная талерантнасць"[30]?

Зрэшты аўтар сам сумняецца ў тым, ці беларускае грамадства сапраўды талерантнае і гэтым прызнае пластычнасць і зменлівасць гэтага паняцця па працягу гісторыі. Ён памяшчае гэта ў кантэкст пэўных глабальных дыскурсаў, якія акрэсліваюць умовы для інтэграцыі краін у супольнасць сёняшніх цывілізаваных дзяржаў. Даследчык лічыць, што ў гэтай сувязі беларусы недастаткова праяўляюць талерантнасць да сэксуальных меншасцей і праяўляюць ксенафобныя адносіны да іншых этнічнх груп. Гэта, на яго думку, з'яўляецца перашкодай на шляху да ўваходжання ў Еўрапейскі Саюз (p. 185).

Нельга пагадзіцца са сцвярджэннем аўтара, што слабае развіццё грамадзянскай супольнасці трэба звязваць толькі з дзеяннямі існуючага ў Беларусі палітычнага рэжыму (p. 128). Гэта больш складанае пытанне, якое патрабуе падрабязнага разгляду. Таксама нельга прыняць і пункт гледжання аўтара адносна таго, што Беларусь у перыяд да 2020 г. зусім „застыла" у сваім нацыянальным развіцці, развіцці нацыянальнай свядомасці і ідэнтычнасці (p. 206). У перыяд 2014–2020 гг., наадварот, назіралася вялікая колькасць ініцыятыў, з'яўляліся новыя пляцоўкі, інфармацыйныя рэсурсы. У гэты пе-

[29] Marx A., *Faith in nation: exclusionary origins of nationalism*, Oxford–New York 2003.

[30] Wolff R. P., Moore, Jr., B., Marcuse H., *A critique of pure tolerance*, Boston 1965.

рыяд назіральнікі ўнутры Беларусі адзначалі пэўны прагрэс і з асцярожным аптымізмам ацэньвалі перспектывы нацыяналізацыі беларускага грамадства і яе няўхільнасць[31]. Масавае святкаванне 100-годдзя абвяшчэння незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі ў 2018 г., пра што, зрэшты, аўтар сам піша і такім чынам супярэчыць сабе, таксама сведчаць пра адваротнае (p. 219).

Аўтар агляду не згодны з даследчыкам у тым, што выкарыстанне нацыянальнага бел-чырвона-белага сцяга падчас падзей 2020 г. сведчыла пра неэфектыўнасць антынацыянальнай палітыкі (p. 220). Гэта хутчэй сведчыла пра жаданне мець альтэрнатыўныя сімвалы. Наўрадці падтрымка нацыянальнай сімволікі была вельмі глыбокай, паводле пераканання аўтара гэтага агляду.

Гаворачы пра перыяд першай паловы 1990-х гг., калі беларуская нацыянальная ідэя, пад якой аўтар разумее нацыянальную ідэнтычнасць і самасвядомасць, істотна развівалася, ён згадвае як прыклад такога развіцця дзіцячую тэлевізійную праграму „Калыханка" і яе музычнае суправаджэнне на беларускай мове (p. 95). Але даследчык памыляецца, бо праграма для дзяцей з такой назвай з'явілася на тэлебачанні БССР яшчэ ў студзені 1981 г.[32]

Важнай тэмай, на якой аўтар спыняецца, з'яўляецца праблема і спадчына сталінскіх рэпрэсій і сталінізму агулам. Пры гэтым аўтар не піша пра хаця б ацэначныя і існуючыя на сёняшні дзень лічбы ахвяр савецкіх чыстак (p. 88). Ён двойчы называе імя свайго дзеда, які загінуў ад рук савецкіх рэпрэсіўных органаў (p. 44, 135),

---

[31] Аляксей Ластоўскі: *Радыкальны нацыянальны праект беларусам ажыццявіць немагчыма, але тэндэнцыя нацыяналізацыі няўхільная. Інтэрв'ю даследчыка „Палітычнай сферы" Аляксея Ластоўскага*, https://palityka.org/2016/05/intervju-dasljedchyka-palitychnaj-sfjery-aljaksjeja-lastouskaha/ (апошняе наведванне 18 чэрвеня 2023 г.).

[32] *Калыханка (тэлеперадача)*, https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Калыханка_(тэлеперадача) (апошняе наведванне 14 траўня 2023 г.). Гл. таксама: *Фільм „Калыханцы-35"* https://www.youtube.com/watch?v=fg6Q9eEv5VM (апошняе наведванне 14 траўня 2023 г.); *„Калыханка" – 20 лет (БТ, 14.01.2001) фрагмент*, https://www.youtube.com/watch?v=Y2N7RaBksgo&t=27s (апошняе наведванне 14 траўня 2023 г.).

але называе толькі колькасць сасланых камуністамі рэпрэсаваных сялян („кулакоў”) з БССР у 15 600 чалавек (p. 42). Апублікаваныя на сёння даследванні і матэрыялы дазваляюць меркаваць аб маштабах і жахах савецкага тэрора[33].

Аўтар прысвяціў сваю манаграфію супольным лёсам і інтарэсам украінцаў і беларусаў. Аднак у кнізе ёсць моманты, якія супярэчаць гэтай задуме аўтара. Даследчык, прысвячае сказ крытыцы ўкраінскага батальёна „Азоў”, які і на момант выхаду кнігі і напісання агляду паспяхова абараняў Украіну ад агрэсіі Расіі. Не зусім зразумелыя закіды „скрайняга нацыяналізму” і „ксенафобіі” (p. 165). Гэта тым больш незразумела ўлічваючы, што патэнцыйная аўдыторыя кнігі ідэалагічна разнастайная і ўключаць будзе не толькі прыхільнікаў дамінуючай на сёняшні дзень у акадэмічных установах і мас-медыя ліберальных поглядаў (і звязанай з імі палітычнай карэктнасці), але і людзей якія не падзяляюць такія светапоглядныя і ідэалагічныя прынцыпы.

Трэба таксама абмеркаваць ужыванне даследчыкам тэрміналогіі. У англамоўнай літаратуры ў большай ступені прынята такое словазлучэнне як „Polish-Lithuanian Commonwealth” для Рэчы Паспалітай пасля 1569 г. Але аўтар у гэтым сэнсе не вельмі паслядоўны. У двух месцах ён выкарыстоўвае як агульнапрынятае, так і хутчэй ужыванае ў польскамоўнай літаратуры „Rzeczpospolita” (p. 3, 114). Далей па тэксце відаць, што ён большую перавагу аддае польскаму тэрміну (p. xiv, 3, 82, 114, 165, 187, 194). Толькі ў адным месцы ён выкарыстаў агульнапрыняты тэрмін (p. 26).

Такая ж непаслядоўнасць відавочная ў аўтара ў выпадку ўкраінскай геаграфічнай і гістарычнай назвы горада Чарнігаў. У адным

---

[33] Кушнер В.Ф., *Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у 1920–1930-я гг.*, [у:] *Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый)*, пад рэд. В.І. Галубовіча і Ю.М. Бохана, Мінск 2005; Адамушка У.І., *Палітычныя рэпрэсіі 20–50-ых гадоў на Беларусі*, Мінск 1994; Кузнецов И., *Политические репрессии на Беларуси в 1917–1952 гг.*, [у:] „Гістарычны альманах”, Т. 7, 2002, с. 65–81; Раманава І., *Улада і грамадства: БССР у 1929–1939 гады ў дакументах Асобага аддзела/Асобага сектара ЦК КП(б)Б*, [Вільня] 2019.

выпадку ён выкарыстаў беларускую лацінічную транслітэрацыю (Charnihau, p. 145). Аднак у большасці выпадкаў ён чамусьці выбраў рускую транслітэрацыю: Chernigov (p. xxiv, 15, 40, 57, 288). Даследчык таксама зрабіў памылку на пачатку кнігі, калі назваў сталіцу Хазарскага каганата „Атылай" (Attila) (p. 15). На самой жа справе правільная назва гучыць як Ітыль (на англійскай мове – „Atil").

Аўтар шырока выкарыстоўвае ў тэксце тэрмін „беларуска-украінская цывілізацыя", але побач з ім фігуруе „русінская цывілізацыя" (p. 53, 79), а таксама „заходнерусінская цывілізацыя" (p. 55–71, 84, 188). Варта было б пераасэнсаваць мэтазгоднасць частага ўжывання гэтага паняцця, бо яно можа быць пераблытана з „заходнерусізмам" (p. 163).

Даследчыку варта было б таксама суправаджаць некаторую інфармацыю, якую ён дае для ілюстрацыі ці пацвярджэння сваіх тэзісаў, спасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы ці хаця б сігналізаваць у спасылках, што гэта з яго асабістага архіву (прыкладам гэтага можа быць інфармацыя аўтара на старонках 212 і 231). Да таго ж, калі не з віны аўтара, то выдаўцоў, было скажона прозвішча беларускага навукоўца Вячаслава Шведа. Замест правільнай формы ў кнізе ўжыта чамусьці слова „Swed" (p. 279).

Неабходна звярнуць увагу на якасць тэкста ў манаграфіі. Ствараецца ўражанне, што ўводзіны (p. 1–10) перакладаліся літаральна. Гэта вялікая памылка і нават недаравальна, што гэта ёсць на самым пачатку кнігі, бо можа разахвоціць чытачоў да азнаямлення з рэштай кнігі. Бачны вялікі кантраст з першым раздзелам у сэнсе якасці тэкста (p. 11–30). Таксама і трынаццаты раздзел выклікае падобнае пытанне (p. 193–203). Адрозніваецца нават сам стыль тэксту. Відавочна пры гэтым, што некаторую ролю ў стварэнні раздзелаў адыгралі падсумаванні на англійскай мове з папярэдняй кнігі аўтара „Шляхі да беларускай нацыі"[34].

Ёсць таксама памылкі ў некаторых словах. У адным месцы аўтар відавочна меў на ўвазе „exciting", але замест гэтага ў тэксце

[34] Мурзёнак П. М., *Шляхі да беларускай нацыі*.

недарэчнае „exiting”, калі ён апісвае паслявыбарчыя дэманстрацыі ў 2020 г. у Беларусі (p. 130). Пры тым, што аўтар агляду не мае закідаў адносна структуры кнігі, варта было б тым не менш змясціць галерэю дзеячоў дзяржавы, навукі, мастацтва і культуры Беларусі (p. xxix–xxxv) у канцы манаграфіі.

Абмеркаваўшы моцныя і слабыя бакі кнігі Пятра Мурзёнка хацелася б падзяліцца рэфлексіямі агульнага характару, якія маюць хутчэй палемічны характар. Кніга аўтара тут з’яўляецца добрым прыкладам пэўных тэндэнцый і ўзораў мыслення характэрных для беларускіх аўтараў як у Беларусі, так і прадстаўнікоў дыяспары. Яна не толькі падводзіць вынікі, але і пашырае поле дыскусій па значнаму колу пытанняў.

Самі гэтыя рэфлексіі хоць фактычна палемізуюць з меркаваннямі даследчыка, але не з’яўляюцца нейкімі дадатковымі заўвагамі, а спрабуюць акрэсліць агульныя рамкі таго, што магло б збалансаваць падыходы да працы беларускіх даследчыкаў сёння. Некаторыя з іх працягваюць сюжэты, абмеркаваныя вышэй, але таксама пацвярджаюць слушнасць выказаных Пятром Мурзёнкам думак. Натуральна, гэтыя рэфлексіі можна расцаніць як суб’ектыўныя, але гэта толькі спроба зрабіць уклад у разуменне дастаткова складаных культурных і сацыяльных працэсаў, якія перажывае сёння Беларусь і, трэба дадаць без пафасу, увесь свет. Хацелася б, каб на гэтыя развагі адрэагаваў не толькі аўтар манаграфіі.

Перш за ўсё варта не столькі крытыкаваць, колькі палемізаваць з аптымістычнай перспектывай аўтара. Яна датычыць як уласна беларускай праблематыкі, так і больш глабальнай перспектывы і вектараў будучага развіцця цывіліізацыі, да тэмы якой даследчык звяртаецца ў манаграфіі. Напрыклад, як адзначалася вышэй, аўтар лічыць наступны пасля 2020 г. перыяд развіцця нацыянальнага будавання ў Беларусі спрыяльным (p. 262). Але аўтар ніяк не абгрунтоўвае сваю думку. Наадварот, пасля 2020 г. шмат якія культурныя ініцыятывы, медыі і арганізацыі былі ліквідаваны, пра што аўтар сам піша (p. 232). Таксама магчымасці неяк уплываць на агульную

культурную сітуацыю ў краіне рэзка абмежаваны пасля таго, як шмат актыўных прадстаўнікоў беларускай культурнай сферы выехалі з Беларусі.

Аўтар шмат у чым (і гэта з’яўляецца перавагай яго кнігі) стараецца супаставіць розныя перспектывы і сцэнары. Ён слушна піша пра агульны крызіс лібералізму (p. 200, 243–244), наступствам чаго з’яўляецца адраджэнне нацыяналізму і ролі нацыянальнай дзяржавы. Даследчык аднак схільны крытыкаваць „антыэмігранцкія” партыі (p. 151, 185). Ён пры гэтым праігнараваў зробленае больш 15 гадоў таму назіранне амерыканскага гісторыка нямецка-яўрэйскага паходжання Вальтэра Лакера (Walter Laqueur, 1921–2018) аб тым, што палітычнае кіраўніцтва еўрапейскіх краін не пытала згоды выбарцаў на прыезд эмігрантаў. Менавіта на іх плечы ўсклалася не толькі вага выдаткаў, але і сацыяльных наступстваў прыбыцця значнай колькасці культурна адрозных жыхароў[35].

Мурзёнак цытуе беларускага географа Аркадзя Смоліча, які сцвярджаў, што беларусы падрыхтаваны да ролі грамадзян краіны, у якой справядлівасць пераможа, але яны кепска падрыхтаваны да барацьбы за жыццё ў сучасны момант (p. 126). Гэтае выказванне ўказвае як на ўтапічнасць поглядаў часцяком пераважна левых ці лева-радыкальных беларускіх інтэлектуалаў у мінулым XX ст., так і падкрэслівае пэўны ідэалізм самога аўтара манаграфіі. Але калі быць паслядоўным у тым жа духу як сам даследчык, які дае розныя сцэнары развіцця беларускай дзяржаўнасці (у т. л. песімістычныя), то трэба адзначыць, што аптымізм павінен быць супастаўлены з супрацьлеглай перспектывай. Тым больш, што парадаксальным чынам гэта толькі б даводзіла рацыю Пятра Мурзёнка. Пад „новай цывілізацыяй”, якая прыйдзе на змену сучаснай, аўтар хутчэй за ўсё мае на ўвазе канечне ж не камуністычны (ці сацыялістычны) ідэалагічны праект, але глабалізаваны свет. Аднак тут для справядліва-

[35] Laqueur W., *The Last Days of Europe: Epitaph for an Old Continent*, New York 2007.

сці трэба запярэчыць, што выказваліся ўжо сумневы ў тым, што новая версія „светлай будучыні" для ўсяго чалавецтва сапраўды спраўдзіцца. Выказваліся думкі пра надыход хутчэй глабальнай „анархіі" і дэстабілізацыі свету, з'яўленне элементаў распаду і сацыяльна-палітычнай дысфункцыі не толькі ў рэгіёнах, якія раней называліся „трэцім светам" (цяпер гэта „глабальны поўдзень"), але і ўласна ў краінах Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. У гэтым сэнсе палітычны, эканамічны і сацыяльны хаос у Афрыцы, Азіі ці Паўднёвай Амерыцы прапаноўвалася разглядаць як правобраз таго, што чакае цывілізаваныя заходнія краіны[36].

Не выключана, што і грамадзянскія канфлікты і войны будуць у болшай колькасці адбывацца не толькі на „перыферыі", але і ў цэнтры Заходняй цывілізацыі[37]. Узмацненне геапалітычных канфліктаў і сутыкненне інтарэсаў дзяржаў таксама верагодныя. Гісторыя, якая можа ўключаць такія сутыкненні, не „скончылася", але „вярнулася"[38]. У такіх умовах не столькі супрацоўніцтва паміж краінамі, колькі прынцып „кожная нацыя сама за сябе" становіцца больш распаўсюджаным[39]. Таксама не толькі гісторыя, але і геаграфія з'яўляецца паказчыкам патэнцыяльных ці актуальных канфліктаў[40]. Глабалізацыя і інтэграцыя (у т. л. і еўрапейская) можа выклікаць імкненне да лакалізму (своеасаблівая актуалізацыя „тутэйшасці"), да дэцэнтралізацыі[41], хоць пазбегнуць цэнтраліза-

[36] Kaplan R.D., *The Coming Anarchy: Shattering the Dreams of the Post Cold War*, New York 2000.

[37] Шимов Я., *Гражданских войн будет больше. 1919: воспоминания о будущем?*, https://www.svoboda.org/a/29877461.html (размова з гісторыкам Б Каланіцкім; апошняе наведванне 7 траўня 2023 г.).

[38] Kagan R., *The Return of History and the End of Dreams*, New York 2008.

[39] Bremmer I., *Every Nation for itself: Winners and Losers in a G-Zero World*, New York 2012.

[40] Kaplan R.D., *The Revenge of Geography: What the Map Tells Us About Coming Conflicts and The Battle Against Fate*, New York 2012.

[41] Scott J.C., *The Art of Not Being Governed. An Anarchist History of Upland Southeast Asia*, New Haven and London 2009.

цыі становіцца ўсё цяжэй. Не ўсе падзяляюць аптымізм адносна будучыні еўрапейскага кантынента і праекта адзінай Еўропы і заклікаюць пры гэтым цвяроза ўсвядоміць банкруцтва „еўрапейскай мары" і заняпад кантынета[42].

Нельга забываць, што сама мадэрнасць мае далёка не толькі абяцанне дабрабыту і дэмакратыі, але і цалкам аўтарытарнае этатысцкае вымярэнне[43]. Ёсць сумневы адносна таго, што ліберальныя ідэі мадэрнасці, на крызіс якіх звярнуў увагу аўтар, утрымаюцца як і сама гэтая мадэрнасць[44]. Нават сам мадэрны светапогляд з'яўляецца гістарычнай анамаліяй улічваючы тое, колькі пакаленняў існавала з традыцыйным светапоглядам[45]. Дэмакратыя і дабрабыт таксама знаходзяцца ў глабальным (ці, больш правільна, еўра-амерыканскім) свеце пад пагрозай. Гэта звязана з заняпадам і знікненнем сярэдніх клас, з надыходам у заходніх краінах таго, што каліфарнійскі сацыёлаг Джоэл Коткін назваў „неафеадалізмам"[46].

Таму вобраз света і будучыні, які не столькі апісвае, колькі прапануе прыняць па змаўчанні аўтар, не абавязкова мусіць быць адназначны. Але, незалежна ад таго ці здзейсняцца спадзяванні даследчыка ці спраўдзяцца скептычныя папярэджанні і ацэкі адносна будучыні сучаснага света, інтарэсы беларусаў павінна прадстаўляць нацыянальная беларуская дзяржава. Гэта аўтар даводзіць і на працягу кнігі ні ў якой ступені не сумняецца ў гэтым.

Хутчэй вобраз свету і будучыні неабавязкова мусіць быць чорна-белым. Натуральна і цалкам зразумела, што негатыўныя сцэнары канчатковай страты Беларуссю незалежнасці (р. 166) не

---

[42] Laqueur W., *After the Fall: The End of the European Dream and the Decline of a Continent*, New York 2011.

[43] Scott J.C., *Seeing Like a State. How Certain Schemes to Improve Human Condition Have Failed*, New Haven and London 1998.

[44] Heretz L., *Russia on the eve of modernity. Popular religion and traditional culture under the last tsars*, Cambridge–New York 2008, p 238.

[45] Ibid., p. 237.

[46] Kotkin J., *The Coming of Neo-Feudalism: A Warning to the Global Middle Class*, New York–London 2020.

з’яўляецца фантастычным. А вось рэлятывісцкая пазіцыя тут можа быць не толькі інтэлектуальна неабгрунтаванай, але і амаральнай. Акупацыя і анексія могуць прынесці цярпенні і гібель многім беларусам. Таму такі сцэнар сапраўды можна назваць „чорным” без перабольшання. Прымяншаць або рэлятывізаваць гэта раўназначна патуранню акупацыі ці анексіі.

Але ў іншым чорна-белая карціна свету хутчэй прымітывізуе дэбаты і дэзарыентуе, чым дае магчымасць адрозніць тое, што з’яўляецца стратэгічна важным для Беларусі і беларусаў, а што можа несці шкоду. Прыкладам гэтага ў аўтара можа быць т. зв. пытанне меншасцей і канстатацыя ім недастатковай талерантнасці беларусаў адносна некаторых з іх. Тут аднак можна запярэчыць, што ў заходніх краінах прасоўваннеў гэтага пытанняў у мас-медыя і інтэрнэце палярызуе грамадствы, не ставарае новыя каштоўнасці, а, наадварот, спрыяе сацыяльнаму нігілізму. Гэтыя негатыўныя працэсы брытанскі аўтар Даглас Мюрэй назваў „шалёнасцю натоўпаў”[47], або нават часткай таго, што ён у новай сваёй кнізе расцаніў як вайну супраць Заходняй цывілізацыі[48]. Трэба было б нагадаць, што ў перадваенны час, асабліва ў 1920-я гг., у БССР разгортвалася не толькі беларусізацыя, але і адбываўся сацыяльны эксперымент сэксуальнай рэвалюцыі, плён якога быў дастаткова разбуральным для сацыяльнай тканкі грамадства і сям’і[49]. Тое, што ўяўляецца як прагрэсіўны марш „абсалютнага дабра” і рух да святла, можа на практыцы быць злом. Так што тое, што настойліва навязваецца як „неталерантнасць” можа быць механізмам супраціўлення бязладдзю і нігілізму. Таму нельга ўсё ж беларусаў лічыць з “сучасных” пазіцый нейкімі „дрэннымі”. Пры гэтым у іх традыцыйнай ментальнасці (тут гэта нейтральны тэрмін) агульна прымаецца добрая прырода чалавека,

---

[47] Murray D., *The Madness of the Crowds: Gender, Race and Identity*, London–Oxford–New York–New Delhi–Sydney 2019.

[48] Murray D., *The War on the West*, New York 2022.

[49] Гужалоўскі А.А., *Сексуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг.*, Мінск 2017.

падкрэсліваецца базавая чалавечнасць[50]. Трэба, пазбягаючы афарбоўкі некаторых соцыякультурных аспектаў жыцця беларускага грамадства як „цёмных" ці „адсталых", памятаць пра папярэджанне Уладзіміра Конана, які казаў пра асцярожнае і ўважлівае стаўленне да прапанаваных грамадству навацый, так і ўстрымацца ад надання маральнай перавагі ім у сэнсе іх патэнцыялу для беларускага грамадства[51].

Не выпадае сумнявацца, што ўсебаковае і інтэрдысцыплінарнае вывучэнне чорна-белай карціны інтэлектуальнай, ідэалагічнай ці палітычнай палярызацыі, яе прыроду, паходжанне, прэцэдэнты ў мінулым беларускага грамадства яшчэ справа будучыні таксама як вызначэнне яе каранёў як хрысціянскіх ці маніхейскіх, гнастычных ці паганскіх. Але ёсць ужо працы ў сучаснасці, якія могуць быць маяком у такіх даследваннях[52]. Былі асобныя спробы даць ацэнку гэтаму феномену ў мінулым[53]. Аўтар гэтага агляду таксама зрабіў свой сціплы ўклад у вывучэнне праблемы[54]. Можна спекуляваць, у якой ступені інтэрнэт і сёняшнія тэхналагічныя манапалісты спрыяюць і гуляюць на чорна-белай карціне свету і сацыяльнай рэчаіснасці, паглыбляюць падзелы і палярызацыю ў грамадствах[55]. Але, паводле суб'ектыўнага перакanання аўтара агляду і як паказвае разглядаемая манаграфія, мы яшчэ знаходзімся ўнутры гэтай праблемы і не ўсведамляем крытычна яе маштаб.

---

[50] Engelking A., *Kolchoźnicy. Antropologiczne studium tożsamości wsi białoruskiej przełomu XX i XXI wieku*, Toruń 2012.

[51] Конан У., *Антынобміі дэмакратыі і культуры (Нацыянальныя і міжнародныя аспекты)*, [у:] *Беларусіка.* Кн. 3, Мінск 1994, с. 98–104.

[52] Dutton K., *Black and White Thinking: The burden of a binary brain in a complex world*, New York 2020.

[53] Pawluczuk W., *Światopogląd jednostki w warunkach rozpadu społeczności tradycyjnej*, Warszawa 1972.

[54] Paharely A., *„Чорна-белая" рэчаіснасць у святле прэсы міжваеннай Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі і „добрыя" і „дрэнныя рэчы"*, „Studia interkulturowe Europy Środkowo-Wschodniej", 2020, T. 13, s. 278–299.

[55] Foer F., *World without Mind.*

Улічваючы тую ўвагу, якую аўтар кнігі надае нацыянальным элітам, трэба таксама яшчэ раз вярнуцца да тэмы і даць палемічны каментар аб іх. Паўтаруся, што ў аўтара немагчыма адрозніць інтэлектуальныя эліты ад нацыянальных інтэлектуалаў ці прадстаўнікоў палітычнай апазіцыі, хоць гэта ўсё даволі розныя паняцці і групы паводле свайго складу. Развагі ніжэй не столькі пярэчаць тым тэзісам, якія высунуў аўтар, колькі развіваюць яго думкі і завастраюць увагу на адказнасці гэтай групы за будучыню і лёсы краіны, значэнне таго выбару, які яна можа зрабіць ці індывідуальна ці як абстрактная ці згуртаваная супольнасць.

Нават з тых тэзісах, якія даследчык высунуў у кнізе, і, зважаючы на тое, што ён сам усведамляе ўласную адказнасць перад краінай і будучыняй, вынікае, што нацыянальныя інтэлектуалы, прадстаўнікі нацыянальных эліт – пасярэднікі паміж уласна грамадствам і ідэямі[56], якія на дадзены момант могуць успрымацца не столькі як „модныя" ці актуальныя, але як такія, што з'яўляюцца крытэрам пэўнай спеласці краіны і грамадства, гатовасці да таго, каб быць часткай нейкай міжнароднай ці еўрапейскай супольнасці. Вядома, толькі з вялікім спрашчэннем, але можна сцвярджаць, што на землях былога Вялікага Княства Літоўскага гэта ў свой час пасля сярэдзіны XVIII ст. былі ідэі асветніцтва[57], пазней лібералізму[58], яшчэ пазней – сацыялізму[59]. Усё гэта магло (хоць і неабавязкова) звязвацца з адпаведнасцю пэўным знешнім стандартам, якія існавалі там, адкуль гэтыя ідэі і дыскурсы паходзілі[60]. Самі гэтыя ідэі і дыскурсы маглі прымацца на веру

[56] *Intellectuals and the Articulation of the Nation*, eds. R.G. Suny and M.D. Kennedy, Ann Arbor 1999.

[57] Jedlicki J., *A Suburb of Europe. Nineteenth-Century Polish Approaches to Western Civilization*, Budapest–New York 1999, p. 8, 15–17.

[58] Porter B. A., *The Social Nation and its Futures: English Liberalism and Polish Nationalism in Late Nineteenth-Century Warsaw*, „The American Historical Review" 1996, Vol. 101, No. 5 (December), p. 1470–1492.

[59] Snyder T., *The Reconstruction of Nations: Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus, 1569–1999*, New Haven and London 2003, p. 53.

[60] Jedlicki J., *A Suburb of Europe*, p. 16.

як догма ці абсалютная ісціна[61]. Сёння мы таксама маем дачыненне з новымі падобнымі дыскурсамі. А гэта ў т. л. ідэі „абсалютнага дабра", „талерантнасці" і "сацыяльнай справядлівасці" (ці, нават, „касмічнай справядлівасці", паводле слоў Томаса Саўэла)[62].

Паміж шляхтай (ці „дробнай шляхтай"), беларускімі нацыянальнымі інтэлектуаламі на мяжы XIX і XX стст. і сёняшнімі інтэлектуаламі ў Беларусі можа не быць ні генетычнай, ні сацыяльнай сувязі пры тым, што пры поўнай амаль адсутнасці даследванняў на гэтую тэму, можна груба накрэсліць радавод нацыянальнай інтэлігенцыі ад шляхты на прасторах былога Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай агулам[63]. Можна ўсё ж сцвярджаць наяўнасць калі не сацыяльнай ці генетычнай пераемнасці са шляхтай, то, прынамсі, пераемнасць у этасе, якая назіралася, напрыклад, паміж зямельнай арыстакратыяй і вярхушкай сярэдніх клас пры пераходзе да мадэрнага індустрыяльнага грамадства[64]. Справядлівасць, гонар, годнасць і шляхетнасць магчыма разглядаць як спадчыну, якую шляхта пакінула прадстаўнікам нацыянальных інтэлектуалаў. Вяскоўцы традыцыйна ў сваёй ідэнтычнсаці залежалі ад сімвалічнай, міфалагізаванай ці рэальнай постаці „яўрэя" ці „пана", ім належала не толькі сацыяльная, але і інтэлектуальная перавага[65]. Аднак пры гэтым шляхетнасць і годнасць не ўспрымаліся беларускімі вяскоўцамі як нешта важнае. Яны больш цанілі само жыццё, фізічнае існаванне[66]. На вёсцы было прынята кпіць і смяяцца са шляхты, было прынята скептычна ставіцца да прэтэнзій дробных шляхцічаў да вышэйшага сацыяльнага статуса[67].

---

[61] Vakar N., *The Taproot of Soviet Society,* New York 1962, p. 29.

[62] Sowell T., *The Quest for Cosmic Justice*, New York 2001.

[63] Miłosz C., *Rodzinna Europa*, Paryż 1959, s. 30.

[64] Moore Jr. B., *Social Origins of Dictatorship and Democracy. Lord and Peasant in the Making of the Modern World*, Harmondsworth [1966] 1991.

[65] Engelking A., *Kolchoźnicy.*

[66] Асабістае паведамленне доктара гістарычных навук С.М. Токця аўтару рэцэнзіі.

[67] S-ič, *„Adzin łapač, druhu bot, a ja šlachcic – daliboh!"*, „Biełaruskaja Krynica", 1935, № 4, s. 3; Ciotka Julka, *Šlachockaja durnata*, „Biełaruskaja Krynica", 1927, № 2, s. 3.

У пэўным сэнсе „раман” прадстаўнікоў нацыянальных эліт і інтэлектуалаў з сацыялізмам[68] быў не запярэчаннем ідэй годнасці, гонару, шляхетнасці і справядлівасці. Толькі апошняя ўжо разумелася ў класавых катэгорыях, а прадстаўнікі шляхты знаходзілі сябе ў авангардзе барацьбы за „нацыянальныя і сацыяльныя правы”. Аднак апошняе магло перарастаць не столькі ў вырашэнне нацыянальных задач, колькі быць часткай нейкай глабальнай барацьбы „дабра” са „злом”, маніхейскага чорна-белага бачання рэчаіснасці, утапічных і нерэалістычных ідэалаў. Аўтар манаграфіі сам фактычна даводзіць гэта на прыкладзе ўжо прыведзенага вышэй выказвання Смоліча аб тым, што, маўляў, беларусы падрыхтаваны да ролі грамадзян будучыні (p. 126). Варта больш скептычна і асцярожна ставіцца да надання статуса „шляхетнасці” пэўным ідэям „справядлівасці” ў сучасны момант і іх патэнцыялу для будучыні Беларусі і цывілізацыі ў цэлым, бо патэнцыял гэты можа быць разбуральны і негатыўны[69]. Адказнасць нацыянальных эліт якраз павінна быць у тым, каб больш крытычна і асцярожна падыходзіць да ідэй „светлай будучыні”, глядзець на гэта не з пазіцыі знешніх крытэрый, а магчымасцей захавання нацыянальнай ідэнтычнасці і незалежнасці.

Таксама варта пераасэнсаваць абсалютны характар імкнення беларусаў захаваць свой статус як адданых антываенным ідэалам (p. 208). Гэта не перашкаджала беларусам у XX ст. масава ўдзельнічаць у войнах і агрэсіі на баку іншых краін і палітычных (у т. л. таталітарных) рэжымаў. Да таго ж варта было б больш глыбока асэнсаваць і пераацаніць праблему таго, што цягам таго ж стагоддзя нацыянальныя эліты і фактар сілы існавалі як быццам у розных вымярэннях, але на практыцы нацыянальныя эліты не здолелі манапалізаваць ужыванне сілы[70]. Гэта мела і яшчэ можа мець катастрафічныя наступствы як для саміх беларусаў, так і іх суседзяў.

[68] Snyder T., *Reconstructiuon of Nations*, p. 53.
[69] Murray D., *The War on the West*.
[70] Savchenko A., *Belarus – a Perpetual Borderland*, p. 71.

Тут варта зноў звярнуцца да сітуацыі на пачтаку XX ст. Амерыканскі філосаф Уільям Джэймс быў прынцыпова супраць вайны і мілітарызму. Ваенную складовую грамадстваў ён разглядаў як свайго роду фаталістычную бязглуздзіцу[71]. Пры гэтым ён верыў (як сёння аўтар манаграфіі ў "якасна новую цывілізацыю") у непазбежны надыход нейкай формы сацыялізму ў будучыні, грамадства, якое будзе мець больш насалодаў, чым сучаснае на той момант. Аднак ён засцерагаў, што грамадствы не павінны губляць сваёй мужнасці і ваяўнічасці, бо менавіта на гэтых падставах збудаваны дзяржавы. Нават пацыфісты павінны добра ведаць аргументацыю прыхільнікаў вайны і ваяўнічасці ў прынцыпе[72]. Таксама і аўтар гэтага агляду суб'ектыўна лічыць, што мужнасць больш патрэбная беларускаму грамадству, чым „талерантнасць".

Іншая развага, якую выклікала кніга Пятра Мурзёнка ў аўтара гэтага агляду, датычыць як тэмы нацыяльных эліт, так і небяспекі з боку расійскага імперыялізму (p. 77, 180, 199), а дакладней таго, як гэты імперыялізм і эксперты на яго службе здабываюць патрэбныя веды пра аб'ект імперскіх памкненняў. Тым больш, што вядома пра два дыскурсіўныя падыходы імперскай палітыкі Масквы. Адзін з іх гэта мова непрыхаваных пагроз, шантажу і адкрытая агрэсія, а другі–больш мяккі, фармальны і дыпламатычны. Гэта як кантраст паміж умоўным „добрым" і „дрэнным" паліцыянтам. Гэта розніца паміж „сутнасным" дыскурсам і карэктным фармальным[73].

У 2018 г. з'явілася праца расійскіх сацыёлагаў „Зразумець Беларусь: нататкі вандроўных сацыёлагаў". Яна была заснавана на інтэрв'ю з некалькімі дзесяткамі прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных эліт. Сваю ролю карэктны і мяккі падыход тут безумоўна

[71] Pick D., *War Machine. The Rationalisation of Slaughter in the Modern Age*, New Haven and London 1993, p. 15.

[72] Гл. падрабязней у: James W., *The Moral Equivalent of War*, New York 1910.

[73] Миллер А., *Введение в историческую политику в Восточной Европе начала XXI в.*, [у:] *Историческая политика в XXI веке*, Москва 2012, с. 31.

адыграў. Дарэчы, тэма шляхетнасці ў гэтай кнізе таксама фігуруе[74]. Рэакцыі на гэтае выданне былі як у расійскім друку[75], так і ў беларускай інтэлеткуальнай інтэрнэт-прасторы. Пры чым у апошнім выпадку аўтар водгуку нават згадаў, што сацыёлагі, у полі зроку якіх апынулася Беларусь, гэта не проста выпадковыя людзі, а кансультанты і коўчы „палітычных актараў Расіі”[76]. На жаль, з’яўленне гэтага даследвання нельга разглядаць выключна па-за кантэкстам зацікаўленасці Масквы ўтрымаць Беларусь у сферы свайго ўплыву. Аўтар гэтага агляду зусім не лічыць, што поўны недавер і адмова ў супрацоўніцтве з’яляюцца правільнымі падыходамі ў такой сітуацыі, але здаровая доза падазронасці і скепсісу да намераў расійскіх навукоўцаў павінны мець месца.

Прыведеныя заўвагі і палемічныя тэзісы зусім не адмаўляюць высокую вартасць манаграфіі Пятра Мурзёнка. Хутчэй наадварот, гэта сведчыць, што яна сапраўды цікавая, заслугоўвае большай увагі, павінна выклікаць дыскусіі, таму што дадзены тэкст далёка не вычарпаў магчымыя новыя думкі, якія яшчэ з’явяцца і будуць напаўняць дэбаты вакол будучыні Беларусі ў бліжэйшы час і пазней. Памылкі будзе нескладана выправіць. А манаграфію сапраўды можна рэкамендаваць як замежным экспертам, якія цікавяцца беларускай праблематыкай, так і тым, хто пачынае вывучаць Беларусь. З упэўненасцю можна сказаць, што яна паслужыць пашырэнню абмеркаванняў актуальных праблем у беларусістыцы як на бацькаўшчыне, так і па-за яе межамі.

---

[74] Борисов С., Юшкова-Борисова Ю., *Понять Беларусь: записки странствующих социологов*, [s. l.] 2018.

[75] *Российские ученые-социологи – о секретах белорусского характера*, https://rg.ru/2018/05/17/rossijskie-uchenye-sociologi-raskryli-sekrety-belorusskogo haraktera.html (аплшняе наведванне 14 траўня 2023 г.).

[76] Лаврухин А., *О книге „Понять Беларусь: записки странствующих социологов”*, https://nmn.media/articles/6891 (апошняе наведванне 14 траўня 2023 г.).